# РЭФОРМЫ СУПРАЦЬ КРЫЗІСУ

**Эканамічны крызіс набірае моц.** Для большасці жыхароў Беларусі яго ўдар будзе вельмі цяжкім. **Гарантыі, якія цяперашняя ўлада давала людзям, не могуць быць выкананыя без сур'ёзных рэформаў.**

Галоўны абавязак улады – абараніць сваіх грамадзянаў. Улады Беларусі гэтага рабіць не ўмеюць і не хочуць.

**У Аб'яднаных дэмакратычных сіл Беларусі ёсць Антыкрызісная платформа. Для абароны нашых грамадзянаў мы патрабуем тэрмінова прыступіць да рэалізацыі наступных мер:**

- Прызначыць грашовую дапамогу па беспрацоўі на ўзроўні пражытковага мінімуму. Пры звальненні работнікаў у сувязі з заканчэннем тэрміну кантракту і пры скарачэнні выплочваць грашовую кампенсацыю за кошт наймальніка.
- Ствараць новыя працоўныя месцы за кошт стымулявання бізнесу.
- Адмовіцца ад адміністратыўнага рэгулявання колькасці супрацоўнікаў у індывідуальных прадпрымальнікаў.
- Стварыць эфектыўную дзяржаўную сістэму перакваліфікацыі беспрацоўных.
- Усталяваць штомесячныя даплаты навучэнцам і студэнтам, мнагадзетным сем'ям, інвалідам і дзецям-сіротам на ўзроўні мінімальнага спажывецкага бюджэта.
- Усталяваць стандарт сярэдняй пенсіі ў памеры 50% ад узроўню сярэдняй зарплаты. Зняць абмежаванні на занятасць пенсіянераў.

**Сродкі на дапамогу людзям можна знайсці, калі:**

- Скараціць не менш як на 30% фінансаванне органаў улады.
- Адмовіцца ад стратных праектаў (будаўніцтва АЭС, аграгарадкоў, лядовых палацаў і г.д.).
- Увесці мараторый на закупку дзяржаўным коштам аўтатранспарту і офіснай тэхнікі.
- Усталяваць абмежаванні па акладах і матэрыяльных узнагародах для кіраўнікоў прадпрыемстваў, якія атрымліваюць бюджэтныя датацыі.

**Гэтыя першачарговыя меры дазволяць зберагчы беларусаў ад рэзкага падзення ўзроўню жыцця. Але для захавання стабільнасці і развіцця краіна патрабуе сур'ёзных рэформаў. Рэалізацыя Антыкрызіснай платформы – гарантыя бяспекі і дабрабыту кожнага жыхара Беларусі.**

**Пераўтварэнне эканомікі немагчымае без пераўладкавання грамадства.** Патрэбны справядлівыя законы і гарантыі падпарадкавання ім. Патрэбны **адказнасць і кантралюемасць улады. Калі ўлада няздольна** абараніць народ сваёй краіны, **яна павінна сысці.** Хай больш кампетэнтныя і адказныя людзі атрымаюць магчымасць вывесці Беларусь з крызісу.

**Мы патрабуем ад улады абараніць грамадзянаў ад наступстваў крызісу і адкрыць дарогу рэформам.**

**НЕ НАРОД ДЛЯ ЎЛАДЫ, А ЎЛАДА ДЛЯ НАРОДА!**